Падтрымай "Вясну" на PATREON

На журналіста Змітра Лупача склалі яшчэ адзін пратакол за парушэнне заканадаўства аб СМІ

17.02.2020 **Тэгі**: адміністратыўны пераслед, свабода слова



Журналіст Зміцер Лупач.

На журналіста-фрылансера з Глыбокага Змітра Лупача міліцыянты склалі чарговы пратакол. Гэтым разам адміністрацыйны пераслед распачаў Шаркаўшчынскі РАУС, паведамляе служба маніторынгу «Беларускай асацыяцыі журналістаў».

Журналіста ў Глыбокім наведаў старшы інспектар аддзела аховы правапарадку і прафілактыкі Шаркаўшчынскага РАУС **Андрэй Курэц** і склаў на яго пратакол за парушэнне заканадаўства аб СМІ паводле **часткі 2 артыкула 22.9 КаАП** («Незаконны выраб і распаўсюд прадукцыі СМІ»).


Падставай для адміністрацыйнай справы стаў сюжэт на тэлеканале «Белсат» пра дзіцячую пляцоўку ў гарадзкім пасёлку Шаркаўшчына.

Зміцер Лупач не лічыць сябе вінаватым і зьвяртае ўвагу, што ён не вырабляе прадукцыю СМІ. Чарговы пратакол журналіст лічыць перасьледам з боку ўладаў за прафэсійную дзейнасьць.

Нагадаем, сёлета ў Змітра Лупача гэта трэцяя па ліку адміністрацыйная справа паводле арт. 22.9 КаАП. 10 студзеня судзьдзя Пастаўскага раённага суду **Натальля Максімовіч** пакарала журналіста штрафам за супрацу з тэлеканалам «Белсат». А 27 студзеня суддзя Глыбоцкага суду **Станіслаў Трапук** вярнуў справу ў міліцыю на дапрацоўку.

Твитнуть






"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў



ГАЛОЎНАЕ

Без зменаў. Адбылася апеляцыя па справе "Вясны"



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 11 палітычных зняволеных

Старэйшыну баптысцкай царквы “Новая Зямля” Андрэя Мамойку і яго жонку Веру асудзілі да “хатняй хіміі”

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Шэсць еўрапейскіх парламентарыяў сталі "хроснымі" для беларускіх палітвязняў

Да 20 гадоў калоніі: фігурантам "справы Nexta" запрасілі тэрміны

Затрыманне футбольнага фаната, новы "тэрарыст": хроніка пераследу 21 красавіка (дапоўнена)

Былога ўчастковага асудзілі да 6 гадоў калоніі па справе "Чорнай кнігі Беларусі"

"Не хацелася, каб хтосьці трапляў туды". Экс-палітзняволены Аляксандр Бабко распавёў пра пераслед па "справе цюкоў"

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023



ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022





ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

СЯБРОЎСТВА

ENEMO


HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh













E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

